СОЮЗ ЕВРАЗИЯ

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

19 СНЕЖНЯ 2017 г. АЎТОРАК №244 (28608)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Новы год у санаторыі



Там, дзе робяць ёлачныя цацкі



«Звяздовец» прыняў прысягу

СТАР. 14

ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй РЫБАК, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі:**

*«Адна з версій, якія прапрацоўваюцца, па змене сістэмы збірання дзяржпошліны за выдачу дазволу на допуск транспартнага сродку да ўдзелу ў дарожным руху — памесячная выплата гэтага збору з магчымасцю карэктаваць тыя тэрміны, за якія ўжо заплачана. Напрыклад, калі чалавек карыстаецца аўтамабілем тры месяцы на год, то і плаціць трэба за тры. Калі збіраецца прадаваць транспартны сродак, то заплаціць можна за месяц. Павінна быць пэўная гібкасць. Сёння гэта такая сумесная пазіцыя ўрада і парламента».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 19.12.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 2,0213 | ▼ |
| Еўра | 2,3801 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0344 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0725 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# Пачатак дарогі, пачатак зімы...



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Чатырохгадовы мінчанін Георгій БОХАН каля «нулявога кіламетра».

■ З нагоды

## «У газет і кніг ва ўсе часы застанецца свая аўдыторыя»

### Адна з найстарэйшых друкарняў доўга была цёскай «Звязды»

**Сёння Выдавецтва «Беларускі дом друку» святкуе свой 100-гадовы юбілей. Яго прадукцыю трымаў у руках літаральна кожны з нас: гэта не толькі газеты і часопісы, але і пашпарты. Пра тое, што інтэрнэт не заменіць газеты ў друкаваным выглядзе, чаму тыражы дзіцячай літаратуры не змяншаюцца, як вырабляўся сцяг №1 для беларускай сталіцы і калі з'явіцца першая біяметрычныя пашпарты, мы пагутарылі з генеральным дырэктарам РУП «Выдавецтва Беларускі дом друку» Раманам АЛЕЙНІКАМ.**



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

***— Раман Сцяпанавіч, у свой час ваша прадпрыемства насіла назву друкарня выдавецтва «Звязда». Наша газета ідзе поруч з вамі доўгі час...***

— Так, сапраўды калісьці мы мелі і такую назву. Са «Звяздой» у нас гістарычна склаліся трывалыя партнёрскія адносіны. Падчас вайны, з мая 1942 года, нашы падпольшчыкі выносілі шрыфты для друку газеты, аб чым сведчыць і адпаведная памятная шыльда на будынку. А дагэтуль была 1-я Савецкая друкарня, друкарня імя І. В. Сталіна... У 1917 годзе наша прадпрыемства ўзнікла таксама не на пустым месцы: яго перайменавалі з Мінскай губернскай у друкарню Савета Народных Камісараў Заходняй вобласці і фронту. Таму яго гісторыі значна больш за стагоддзе. Дарэчы, у 1916 годзе Мінская губернская друкарня разам з пермскай і віленскай уваходзіла ў тройку найбуйнейшых у Расійскай імперыі.

СТАР. 4

■ Па сутнасці

## ПРА САЦЫЯЛЬНЫЯ ПАСЛУГІ — З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

**Каму аказваюцца паслугі сядзелкі і на якіх умовах? Калі будуць павышаны зарплаты сацыяльным работнікам? У колькі абыходзіцца дзяржаве знаходжанне аднаго чалавека ў інтэрнатах рознага тыпу ў месяц? На гэтыя і іншыя пытанні адказалі спецыялісты Міністэрства працы і сацыяльнага абслугоўвання на сайце свайго ведамства падчас анлайн-канферэнцыі на тэму «Сістэма сацыяльнага абслугоўвання ў Рэспубліцы Беларусь».**

**У анлайн-канферэнцыі прымалі ўдзел намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Аляксандр РУМАК, начальнік галоўнага ўпраўлення сацыяльнага абслугоўвання і сацыяльнай дапамогі Мінпрацы і сацабароны Марыя ГАРБАЦЭВІЧ і намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення сацыяльнага абслугоўвання і сацыяльнай дапамогі Мінпрацы і сацабароны Таццяна ФЁДАРАВА. Мы выбралі пытанні, адказы на якія будуць цікавыя большасці нашых чытачоў.**

### Замяшчальная сям'я або сядзелка

***— Прыняты дакумент, у якім гаворыцца, што староннія людзі могуць браць у сям'ю пажылога чалавека і даглядаць яго. Удакладніце, калі ласка, каго можна прыняць у сям'ю?***

**Аляксандр РУМАК:**

Сапраўды, новай рэдакцыяй Закона «Аб сацыяльным абслугоўванні» прадугледжана новая форма сацабслугоўвання — аказанне сацыяльных паслуг у замяшчальнай сям'і. Гэта значыць, што фізічная асоба можа аказваць сацыяльныя паслугі паўналетняму непрацаздольнаму грамадзяніну ва ўмовах сумеснага пражывання і вядзення агульнай гаспадаркі. Пры гэтым чалавек, які аказвае такія паслугі, не павінен быць сваяком непрацаздольнага чалавека.

СТАР. 4

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

У першых нумарах 2018-га — календары: насценны, рэлігійны і народны

Працягваецца падпіска на «Звязду» на І квартал і І паўгоддзе 2018 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!